**УДК (392+75.046)(476.5)“18”**

# ДА ПЫТАННЯ ПРА РАЗМЯШЧЭННЕ ІКОН У ХАТАХ ПРАВАСЛАЎНЫХ СЯЛЯН ПОЛАЦКАГА ПАВЕТА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ ХІХ СТ.: НА МАТЭРЫЯЛЕ АРХІЎНЫХ КРЫНІЦ

***Г.А. Флікоп-Світа***
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Минск, Рэспубліка Беларусь

*Артыкул прысвечаны вывучэнню колькаснага і сюжэтнага складу абразоў, якія размяшчаліся ў хатах праваслаўных сялян Полацкага павета. Даследаванне выканана пры выкарыстанні археаграфічных матэрыялаў. З крыніц другой паловы XIX ст., якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, удалося вызначыць звыклую колькасць хатніх ікон для гэтага рэгіёна, выявіць найбольш распаўсюджаныя сюжэты, высветліць, у якой тэхніцы маглі быць выкананы такія абразы і дзе іх набывалі сяляне. Устаноўлена, што ікон найчасцей было паўдзясятка, звычайна былі прадстаўлены сюжэты Ісуса Хрыста, Божай Маці, Св. Мікалая, Св. Юрыя, Св. Міхаіла, Св. Параскевы, сустракаюцца і іншыя выявы. Абразы часта маглі быць друкаванымі, а не пісанымі, каштавалі танна, купляліся сялянамі на кірмашах, сярод ікон сустракаюцца і выявы ў заходняй іканаграфіі, уласцівай для каталіцкай традыцыі.*

На сённяшні дзень у шырокай грамадскасці даволі трывала ўкаранілася ўяўленне пра тыповы выгляд покуці традыцыйнай беларускай хаты, дзе ключавое месца належыць іконе, аздобленай вышытым ручніком – набожнікам. У папулярных публікацыях па этнаграфіі беларусаў, у расказах экскурсаводаў этнаграфічных музеяў не гаворыцца пра час узнікнення чырвонага кута з такімі кампанентамі, а таму ён устрымаецца спрадвечным. Да вывучэння генезіса такой культурна-мастацкай з’явы, як хатні абраз, дагэтуль айчынныя навукоўцы не звярталіся. Разам з тым, разабрацца з падобным феноменам імкнуліся мастацтвазнаўцы з Украіны, якія даследавалі ўкраінскую хатнюю ікону [1–3]. Навукоўцы схіляюцца да думкі, што народныя абразы, напісаныя на дошках і прызначаныя для дамашняй малітвы, ва ўкраінскім ужытку з’явіліся з канца XVIII ст. [4] На беларускіх землях магчыма, у той жа час пачалі таксама з’яўляцца першыя прыклады размяшчэння ікон у хатах, аднак гэта мела лакальны і абмежаваны характар. Найбольшая колькасць хатніх абразоў, што дайшлі да нашага часу, належыць да другой паловы XIX ст. [5, с. 3]. Хутчэй за ўсё, масавымі хатнія іконы сталі з сярэдзіны XIX ст. Трэба сказаць, што яны былі ўласцівыя не для ўсіх рэгіёнаў Беларусі. Пісаныя абразы, якія бытавалі ў сялянскім асяроддзі, паходзяць пераважна з Падняпроўя і Усходняга Палесся [6, с. 292–319]. У сучасных адміністрацыйных межах гэтыя рэгіёны суадносяцца пераважна з Магілёўшчынай і Гомельшчынай. З Падвіння ў музейных зборах фактычна няма помнікаў народнага іканапісу, прызначанага для дамашняй малітвы. Гэта наводзіць на думку альбо пра адсутнасць тут іканапісных цэнтраў, альбо ўвогуле пра адсутнасць практыкі размяшчэння ікон у хатах. Этнаграфічныя фотаздымкі, якія б данеслі да нашага часу выгляд інтэр’ера сялянскага жытла, нам вядомыя з некалькіх рэгіёнаў Беларусі, але не з Падзвіння. Такім чынам, наяўныя візуальныя матэрыялы тут дапамагчы не могуць.

Найбольш вядомай крыніцай інфармацыі пра выгляд покуці ў сялянскім інтэр’еры розных рэгіёнаў Беларусі з’яўляюцца тагачасныя нататкі этнографаў. Пра чырвоны кут на Віцебшчыне (Суражскі, Віцебскі, Полацкі, Дрысенскі, Лепельскі, Люцынскі і Гарадоцкі паветы) у сваіх нарысах П. Шэйн адзначыў наступнае: *“Божница же помещается в левом углу от входа. На божницу свою здешние белоруссы обращают очень мало внимания, так как они отличаются крайним индифферентизмом к религии. Вы увидите там какой-нибудь закоптелый образ, завешанный грязным ручником, без всяких украшений”* [7, С. 6–7]. Гэта, бадай, найбольш вядомая заўвага па разглядаемай праблематыцы для хат Полацкага рэгіёна, што тлумачыцца слыннасцю самога аўтара. Да назіранняў П. Шэйна мы яшчэ будзем звяртацца ніжэй, аднак адзначым, што такое апісанне покуці не з’яўляецца вычарпальным і ўласціва было далёка не для ўсіх хат азначанай мясцовасці. Прынамсі выяўленыя намі археаграфічныя крыніцы другой паловы XIX – пачатку XX ст. дазваляюць скласці больш поўнае ўяўленне пра колькасць і сюжэтны склад абразоў, змешчаных у жытле сялянаў Полацкага павета.

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ўдалося выявіць больш за дзясятак спраў, якія асвятляюць стан цэркваў Полацкага павета ў канцы XIX ст. Адзначым, што ў аналагічных дакументах па храмах іншых рэгіёнаў звесткі пра жытло прыхаджан не прыводзяцца, тады як па названым павеце ўсе разгледжаныя намі крыніцы складзены па агульнай схеме і ўтрымліваюць патрэбную для нас інфармацыю. Пра абразы ў хатах інфармацыя хоць і пададзена даволі сцісла, аднак яна дае ўяўленне пра агульную колькасць абразоў, найбольш пашыраныя сюжэты, спосаб вырабу ікон і іх кошт.

Святар царквы Св. Іллі в. Горспля адзначыў, што ў прыхаджан звычайна бывае ад двух да сямі-васьмі абразоў [8, арк. 17–17 адв.]. А прыхаджане царквы Св. Параскевы в. Улазовічы *“Самым главным украшением своего жилища ... считают иконы, которых у них бывает много – от 5 до 10 и более”* [9, арк. 32 адв.]. У дакументах па іншых прыходах колькасць абразоў у сялянскім жытле не згадваецца, але пры гэтым у 10 крыніцах з 12-ці прыводзяцца найбольш папулярныя сюжэты.

Ва ўсіх гэтых выпадках фігуруюць абразы Ісуса Хрыста і Божай Маці. Святар царквы в. Горспля нават наўмысна падкрэсліў, што сярод даволі значнай колькасці ікон у хатах яго прыхаджанаў цэнтральнае месца – у самым куце – займае абраз менавіта Хрыста Збавіцеля: *“Красный угол в избе неизменно бывает украшен иконами от двух до семи-восьми. Наиболее часто между последними встречаются иконы Божией Матери, Святителя и Чудотворца Николая, Георгия Победоносца; самый же угол всегда занимает икона Христа Спасителя. Все эти изображения бывают обыкновенно лубочного издания и часто в духе католическом, с таковыми же написанными, причём крестьяне на это не обращают особенного внимания, по невежеству или по веротерпимости – объяснить трудно. Иногда вместо всех икон передний угол украшает изваянное или вырезанное из дерева Распятие Спасителя. На нём обыкновенно сказывается характер относительно глубокой древности, иконы же старинные или выдающиеся в каком либо отношении замечать не приходилось”* [8, арк. 17–17 адв.].

Дзявяць святароў Полацкага павета адзначылі, што ў хатах іх прахаджанаў акрамя двух вышэй названых сюжэтаў сустракаюцца іконы Свяціцеля Мікалая: *“В избах крестьянских в красном углу чаще всего приходится видеть иконы: Спасителя, Божией Матери и Святителя Николая Чудотворца”* [10, арк. 11 адв.]. Толькі ў дакументах па Галоўчыцкай царкве ён не згаданы, аднак там гаворыцца агулам пра абразы *“святых угодников Божиих”* [11, арк. 10 адв.]. Іконы Святога Юрыя

Змеяборцы знаходзіліся ў хатах прыхаджанаў гарсплянскай, дваржэцкай, казіміраўскай, сосінскай, улазовіцкай, шацілаўскай цэркваў: *"В чистых избах, или светёлках, находятся святые иконы с изображениями на них по преимуществу Господа Вседержителя Спасителя, Божией Матери, Святителя Николая Чудотворца, Великомученика Георгия Победоносца. Иконы новейшей и не всегда удовлетворительной живописи"* [12, арк. 14 адв.].

Згаданыя вышэй святыя Мікалай і Юрый, а таксама Арханёл Міхаіл былі найбольш шануемымі сярод сялянства. П. Шэін у сваіх матэрыялах па Віцебшчыне адзначае наступнае: *"Из святых самым большим уважением пользуются Микола, Михайла и Юрья или Ягорья, хотя про весеннего и осеннего Юрья есть поговорка: "Два Юрьи – да ободва дурни: одзин голодны, а други холодны. В честь Миколы и Михайлы устраиваются праздники Микольщина и Михальщина. Праздники эти такого рода: в некоторых деревнях имеются образа этих святых, которые в день, им посвящённый, переносятся из хаты в хату, от одного хозяина к другому. Хозяин, который принимает образ, должен задать пир, конечно, с попойкой – справить Михальщину или Микольщину. Религиозная же церемония заключается в том, что перед образом зажигают несколько свечей и немного молятся, так что крестьянин, принмающий к себе образ, снимает его с божницы и несёт к себе, все идут за ним. Пришедши в свою хату, ставит его в божницу. Бабы вешают на божницу чистый ручник, опять зажигают свечи, немного молятся и садятся за стол. Тут же начинается пир и попойка. Про образ же и помину более нет"* [7, с. 14–15]. Цікавасць тут уяўляе не толькі згадка пра найбольш шанаваных святых і абразы з іх выявамі, але і пра абрад "Свяча", які да нашых дзён захаваўся на Гомельшчыне [13].

Акрамя пералічаных найбольш пашыраных сюжэтаў, якія былі ў хатах пераважнай большасці насельніцтва, згадваюцца таксама абразы і з іншымі выявамі. Напрыклад, у прыхаджанаў Дваржэцкай царквы былі таксама і абразы Святога Феадосія: *"В каждом доме имеются иконы, цензурной живописи, по преимуществу Спасителя и событий из его земной жизни, Божией Матери, Святителя Николая, Архистратига Михаила, Георгия Великомученика, Святого Феодосия и др. Старинных икон не встречается"* [14, арк. 6 адв. – 7]. Няма сумневу, што тут маецца на ўвазе Феадосій Чарнігаўскі, які быў кананізаваны ў 1896 г., а незадоўга да гэтай падзеі і адразу пасля яе была створана вялікая колькасць абразоў з яго выявай. Пры гэтым падкрэслім, што сярод захаваных пісаных (а не друкаваных) абразоў, прызначаных для хатняй малітвы, вядомыя толькі адзінкавыя яго выявы, тады як даволі шмат захавалася тагачасных храмавых абразоў – яны адрозніваюцца перш за ўсё вялікімі памерамі.

Цікавы сюжэтны склад абразоў быў у хатах прыхаджан царквы в. Домніцы: *"Иконы в избах больше всего бывают: Спасителя, Божией Матери, Святителя Николая и Страшного суда"* [15, арк. 8 адв.]. Звяртае на сябе ўвагу наяўнасць абразоў Страшнага суда, тады як сярод храмавых твораў такі сюжэт на беларускіх землях быў не вельмі пашыраным, пра што сведчыць іх амаль поўная адсутнасць (вядомы толькі адзін помнік XVIII ст. і два – XIX ст.) і рэдкія згадкі ў пісьмовых крыніцах XVIII–XIX стст.

Настаяцель Пакроўскай царквы в. Сосінцы акрамя згаданых вышэй найбольш папулярных сюжэтаў прыгадвае і некаторыя іншыя: *"В крестьянских домах обыкновенно встречаются иконы: Христа Спасителя, Божией Матери, Святителя Николая, Георгия Победоносца, Кирилла и Мефодия, Крещения Господня, а также иконы двунадесятых праздников. Старинных икон в приходе никаких не имеется"* [16, арк. 22]. Тут звяртае на сябе ўвагу згадка пра абразы Святых Кірылы і Мяфодзія, бо сярод захаваных помнікаў такія ўзоры не вядомыя. Іконы на сюжэты Уваскрэсення і двунадзясятых святаў былі назвычай пашыранымі ў іканаграфічным рэпертуары майстэрняў Уладзімірскіх сёлаў (Мсцёра, Холуй, Палех), якія забяспечвалі іканапіснай прадукцыяй значную частку Расійскай імперыі ў XIX ст. Верагодна, і ў іншых майстэрнях цэнтральных губерняў Расійскай імперыі, якія працавалі на патрэбы простага люду, гэты сюжэт быў папулярным. Як адзначыў вядомы даследчык рускай народнай іконы М. Красілін, гэта быў *"основополагающий, вероучительный образ Воскресения Христова, обязательно с двунадесятыми праздниками"* [17, с. 29]. Ці былі даступныя гэтыя творы беларускім сялянам у Полацкім павеце – не вядома. Прынамсі, сярод тых хатніх абразоў, што дайшлі да нашага часу, нам яны не трапляліся. А сярод дошак мясцовага пісьма Уваскрэсенне сустракаецца не часта і ў адрозненні ад рускіх народных абразоў беларускія захаваныя прыклады ўтрымлівалі толькі адзін гэты сюжэт без двунадзясятых святаў, якія на рускіх творах размяшчаліся ў невялікіх клеймах вакол цэнтральнай кампазіцыі [18, с. 92–93].

Адносна практыкі складання хатняга "іканастасу" даследчыкамі рускага народнага іканапісу адзначалася, што абавязкова быў абраз з той выявай, якой быў прысвечаны мясцовы храм [17]. На беларускіх землях такая практыка была, па ўсёй верагоднасці, вельмі рэдкай. Пра гэта сведчыць амаль поўная адсутнасць хатніх ікон на сюжэты двунадзясятых святаў, а менавіта ім найчасцей былі прысвечаны храмы. У пісьмовых дакументах XIX ст. па Полацкім павеце нам сустрэлася толькі адно сведчанне таго, што ў хатах прыхаджан была ікона з выявай той святой, у гонар якой асвечана царква ў гэтым прыходзе – Св. Параскевы у в. Улазовічы. Пры пераліку абразоў у хатах прыхаджан святар адзначыў наступнае: *"Из икон особенно часто встречаются иконы Спасителя, Богоматери и особенно чтимые в этой местности Святой Мученицы Параскевы, наречённой Пятницы, Святителя Николая Чудотворца (Мир Ликийских) и великомученика Георгия Победоносца"* [9, арк. 32 адв. – 33.].

Што датычыцца тэхнікі выканання, то ў Полацкім павеце, калі меркаваць па разглядаемых пісьмовых крыніцах, былі пашыраны друкаваныя абразкі на паперы. Зразумела, што творы тыражнай графікі каштавалі значна танней за жывапісныя, а таму для сялянаў былі больш даступнымі. Настаяцель царквы в. Шацілава пра абразы ў хатах сваіх прыхаджан у царкоўным нарысе зрабіў наступны запіс: *"В хатах преимущественно встречаются иконы: Спасителя, Божией Матери, Святителя Николая, Георгия Победоносца и других святых угодников. Иконные изображения исключительно на бумаге, в рамах и за стеклом"* [19, арк. 15–15 адв.]. З прыведзеных вышэй цытат вынікае, што друкаваныя абразкі былі таксама ў хатах прыхаджан і іншых цэркваў, у прыватнасці, – у Гарсплянскай. А святар Уваскрэсенскай царквы в. Межава папросту і зазначае, што *"Икона в хатах самого дешевого достоинства, покупаются с рынков или на бумаге или же в готовых рамах в позолоченной бумаге не выше 30 коп. ценой. ...Много польского письма. Старинных икон не встречал..."* [20, арк. 20]. Пад польскім пісьмом тут, верагодна, маецца на ўвазе выява ў заходняй іканаграфіі. Бо такую ж характарыстку гэты парох прыводзіць і ў дачыненне да аднаго з абразоў у самой царкве [20, арк. 9 адв.].

Пра тое, што старажытных абразоў у хатах прыхаджан не было, адзначалі таксама і святары цэркваў у вёсках Дваржэц, Сосінцы, Горспля, Казіміраўка, што вынікае з вышэй прыведзеных нататак. А таксама цікавым аспектам з'яўляецца наяўнасць у прыхаджан каталіцкіх абразкоў. У гэтым выпадку яўна гаворка ідзе пра літаграфіі. Тыя, што

прызначаліся для каталікоў, мелі іншыя сюжэты, іканаграфію. Паказальна, што прыхаджане гарбачэўскай царквы ведалі розніцу паміж такімі выявамі: *"Иконы все новые, православные, старинных нет, католические появляются только там, где арендуют католики землю – только у католиков – различие католических от православных прихожане знают"* [21, арк. 8]; а ў той жа час сяляне, якія складалі прыход гарсплянскай царквы, мелі ў хатах і адныя, і іншыя выявы, а таксама ў іх часта сустракалася разьбяное Укрыжаванне, што акурат характэрна для каталіцкай традыцыі.

Пры пераліку хатніх ікон святары згадвалі найбольш распаўсюджаныя выявы ў сваіх прыходах, але, зразумела, што акрамя іх былі і нейкія іншыя, якія не трапілі ў прыведзеныя спісы. П. Шэін адзначае, гаворачы пра Віцебшчыну, што тут акрамя згаданых вышэй Св. Мікалая, Св. Юрыя і Арханёла Міхаіла адным з найболь шануемых быў і Св. Ілля. *"Святый Илья считается делателем грома и молнии, однако во время грозы вовсе к нему не обращаются, а выносят перед хату кочергу, вилы и помело и кладут всё это около порога, бросают в сторону кучи кусочки вербы, торчавшие от вербного Воскресения за божницей, зажигают венчальные свечи, если таковые имеются в хате. Святому Иллю хоть и приписывают, что он сделал гром, но управлять им он не может. 22-го июля Святой Илья мочится в воду, и с этого дня вода делается холодная и поэтому купаться больше нельзя, так как действительно около этого времени идут дожди. "* [7, с. 14–15].

Праведзенае даследаванне дазволіла атрымаць новыя звесткі, датычныя колькаснага і сюжэтнага складу ікон у хатах праваслаўных сялян Полацкага павета ў канцы XIX ст. Ад нататак тагачасных этнографаў гэтыя даныя адрозніваюцца, бо сведчаць пра тое, што абразоў, як правіла, было некалькі, а не адзін. Колькасць магла быць рознай, фактычна, ад пары абразоў да дзясятку. З пераліку сюжэтаў па хатах асобных прыходаў можна заключыць, што найчасцей мелася паўдзясяткі ікон у сям'і. Сустракаліся як пісаныя творы, так і вырабы тыражнай графікі. Апошнія каштавалі зусім нядорага. Акрамя друкаваных абразкоў, прызначаных для праваслаўнага насельніцтва, у хатах апошніх сустракаліся і творы, прызначаныя для каталікоў – яны адрозніваліся іканаграфіяй. Міжканфесійныя ўзаемаўплывы праяўляліся і ў тым, што ў хатах праваслаўных жыхароў замест ці поруч з абразамі магло быць разьбяное Укрыжаванне, што акурат уласціва для каталіцкай традыцыі.

У жытле сялян Полацкага павета пераважалі абразы Ісуса Хрыста, Божай Маці, Св. Мікалая, Юрыя Змеяборца, Арханёла Міхаіла, Св. Параскевы, што адпавядае найбольш распаўсюджаным сюжэтам народных ікон і іншага рэгіёну – Падняпроўя, дзе захавалася шмат ікон мясцовага пісьма. Аднак на Падзвінні, хутчэй за ўсё, бытавалі вырабы не мясцовыя, бо тут няма такога пласту хатніх ікон, які б дазволіў весці гаворку пра існаванне на гэтых землях у другой палове XIX ст. іканапіснага цэнтра, які забяспечваў рынак іконамі, прызначанымі для дамашняй малітвы. Верагодна, што акрамя згаданых у пісьмовых дакументах літаграфій, тут маглі змяшчацца хромалітаграфіі на метале, якія выпускаліся прадпрыемствамі Банакера і Жако ў Маскве і Санкт-Пецярбургу, і даволі шырока збываліся ў Расійскай імперыі, у тым ліку і на беларускіх землях. Таксама, магчыма, тут прадаваліся іконы, выкананыя ва Уладзімірскіх іканапісных сёлах, бо яны забяспечвалі гэтай прадукцыяй аграмадны рынак [18].

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Осадча, О. Українська хатня ікона XVIII–XX ст. як наукове дослідження / Олена Осадча // Мистецтвознавство'07(1): Науковий збірник. – Львів: СКІМ, 2007. – С. 105–114.
2. Осадча, О. Образ-ікона української хати / Олена Осадча // Мистецтвознавство'07(2): Науковий збірник. – Львів: СКІМ, 2007. – С. 101–108.
3. Осадча, О. Трансформація української хатньої ікони / Олена Осадча // Мистецтвознавство'09: Науковий збірник. – Львів: СКІМ, 2009. – С. 239–248.
4. Осадча, О. Походження української хатньої ікони / Олена Осадча // Наукові дослідження – теорія та експеримент'2009: матеріали четвертої міжнародної науково-практичної конференції (м. Полтава, 18–20 травня 2009 р.). – Полтава: ІнтерГрафіка. – 2009. – Т. 4. – С. 58–62.
5. Іканапісная спадчына Беларусі XVII – пачатку XX ст.: помнікі са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь / укладанне і прадмова Галіны Флікоп-Світы. – Мінск : Кнігазбор, 2019. – 84 с.: іл.
6. Флікоп-Світа, Г. А. Беларускі іканапіс XVI – першай паловы XX ст.: альбом / Г. А. Флікоп-Світа; навук. рэд. Б. А. Лазука. – Мінск : Беларуская навука, 2019. – 365 с.: іл.
7. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / собранные и приведённые в порядок П. В. Шейном. – Т. III. – Санкт-Петербург : типография императорской Академии наук, 1902.
8. НГАБ. – Ф. 2879. – Воп. 1. – Спр. 1. – Кніга запісу звестак па гісторыі царквы Св. Іллі с. Горспля Полацкага павета Віцебскай губерні. – 1842–1899 г. – 23 арк.
9. НГАБ. – Ф. 2850. – Воп. 1. – Спр. 1. – Кніга запісу звестак па гісторыі царквы Св. Параскевы с. Улазовічы Полацкага павета Віцебскай губерні за 1889 г. – 44 арк.
10. НГАБ. – Ф. 2888. – Воп. 1. – Спр. 1. – Кніга запісу звестак па гісторыі Успенскай царквы с. Міткавічы Полацкага павета Віцебскай губерні. – 1828–1897 г. – 12 арк.
11. НГАБ. – Ф. 2891. – Воп. 1. – Спр. 1. – Кніга запісу звестак па гісторыі царквы Св. Мікалая с. Галоўчыцы Полацкага павета Віцебскай губерні. – 1842–1899 г. – 35 арк.
12. НГАБ. – Ф. 2890. – Воп. 1. – Спр. 1. – Кніга запісу звестак па гісторыі царквы Св. Кузьмы і Дзям'яна с. Казіміраўка Полацкага павета Віцебскай губерні. – 1880–1899 г. – 26 арк.
13. Лапацін, Г. "Ікона звалась свячой…" Абрад "Свяча" ў прасторы традыцыйнай культуры Гомельшчыны / Г. Лапацін. – Гомель : Барк, 2013. – 116 с.
14. НГАБ. – Ф. 2880. – Воп. 1. – Спр. 1. – Кніга запісу звестак па гісторыі царквы Св. Мікалая с. Дваржэц Полацкага павета Віцебскай губерні. – 1819–1899 г. – 8 арк.
15. НГАБ. – Ф. 2887. – Воп. 1. – Спр. 1. – Кніга запісу звестак па гісторыі Троіцкай царквы с. Домніцы Полацкага павета Віцебскай губерні. – 1899 г. – 12 арк.
16. НГАБ. – Ф. 2871. – Воп. 1. – Спр. 1. – Кніга запісу звестак па гісторыі Пакроўскай царквы с. Сосінцы Полацкага павета Віцебскай губерні. – 1899 г. – 36 арк.
17. Красилин, М. Народная икона: феномен национальной культуры / М. Красилин // Антиквариат. – 2011. – № 89. – С. 22–39.
18. Ильин, А. Иконописные центры народной иконы / А. Ильин // Антиквариат. – 2011. – № 89. – С. 88–107.

19. НГАБ. – Ф. 2851. – Воп. 1. – Спр. 1. – Кніга запісу звестак па гісторыі царквы Св. Мікалая с. Шацілава Полацкага павета Віцебскай губерні. 1865 – 1895 гг. – 22 арк.
20. НГАБ. – Ф. 2848. – Воп. 1. – Спр. 1. – Кніга запісу звестак па гісторыі Уваскрасенскай царквы с. Межава Полацкага павета Віцебскай губерні за 1842–1899 гг. – 27 арк.
21. НГАБ. – Ф. 2889. – Воп. 1. – Спр. 1. – Кніга запісу звестак па гісторыі царквы Св. Барыса і Глеба с. Гарбачэўка Полацкага павета Віцебскай губерні. – 1878–1898 г. – 12 арк.

**Скарачэнні:**

Воп. – вопіс
НГАБ – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі
С. – сяло
Спр. – справа
Ф. – фонд

**H. Flikop-Svita**

*The article is dedicated to the study of the quantitative and plot composition of the icons that were located in the houses of Orthodox peasants of Polotsk District. The research was carried out using archeographic materials. From the sources of the second half of the 19th century, which are kept in the National Historical Archive of Belarus, it was possible to determine the usual number of household icons for this region, to discover the most common plots, to find out in what technique such icons could be made and where the peasants bought them. It was established that there were usually half a dozen icons, usually the subjects of Jesus Christ, the Mother of God, St. Nicholas, St. Yuriy, St. Michael, St. Paraskevi, there are also other images. Icons could often be printed, not written, were cheap, bought by peasants at fairs, among the icons there are also images in Western iconography, characteristic of the Catholic tradition.*